УДК 2

# ХРЫСЦІЯНСТВА Ў ХХ ст.: НЕКАТОРЫЯ РАЗВАЖАННІ

**Клімуць Лада Яраславаўна,**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)

*У дакладзе разглядаюцца некаторыя праблемы, з якімі сутыкнулася хрысціянства ў ХХ ст. у розных частках свету.*

У ХХ ст. не ўсюды лёгка было быць хрысціянінам. Па звестках Чэндлера і Харві, у ХХ ст. была найбольшая колькасць хрысціянскіх пакутнікаў [3, с. 11]. Большасць сацыялістычных дзяржаў сістэматычна праследавалі хрысціянства, але не ўсе выкарыстоўвалі экстрэмальна жорсткія формы пераследу. Забойствы і заключэнне ў турму былі лёсам нямногіх, большасць цярпела, калі можна так сказаць, паўсядзённыя формы ўціску з боку дзяржавы. Да іх можна аднесці дыскрымінацыю ў адукацыі і на рынку працы, недахоп цэркваў і святароў, высмейванне царквы і яе дзеячаў і сістэматычнае выкарыстоўванне школы і сродкаў масавай інфармацыі для дыскрэдытацыі хрысціянскай веры.

Рэвалюцыйныя нападкі на рэлігію ў цэлым і на хрысціянства ў прыватнасці грунтаваліся на крытыцы рэлігіі XIX ст, па якой яна была не навуковай і “опіумам для народа”, і яе выкарыстоўвалі гаспадары, каб трымаць работнікаў у



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

паднявoленні. Аднак часта рэвалюцыйныя ўрады перараджаліся ў таталітарныя дзяржавы. У Азіі, Афрыцы і Мексіцы нападкі на хрысціянства, хоць яны кіраваліся марксізмам, да таго ж набывалі нацыяналістычную афарбоўку. У Мексіцы, напрыклад, каталіцызм меў доўгую, на працягу стагоддзяў, гісторыю. Аднак Дзіега Рывера і іншыя мастакі рэвалюцыі звярталіся да ідэалізаванага дакалумбавага мінулага і падкрэслівалі каланіяльныя карані хрысціянства.

Больш селектыўныя нападкі на канкрэтныя хрысціянскія канфесіі ці на хрысціян, якія прытрымліваліся асобных тэалагічных ці палітычных поглядаў, мелі розныя прычыны. Напрыклад, у сталінскі перыяд грэка-католікі (уніяты) атаясамліваліся з украінскім нацыяналізмам. Нацысты падчас акупацыі Польшчы забілі некалькі тысяч каталіцкіх святароў. У перыяд грамадзянскай вайны ў Іспаніі ў 1936 – 1939 гг. левы ўрад падазраваў духавенства ў правых сімпатыях, і некалькі тысяч каталіцкіх святароў і манахінь былі забіты рэспубліканцамі. У 1960–80-х гг. святары, манахіні і рэлігійныя актывісты часта падвяргаліся праследаванням з боку правых ваенных рэжымаў у Лацінскай Амерыцы і Азіі з-за іх сапраўдных ці ўяўных левых сімпатый. Тут самы яскравы прыклад – Сальвадор, дзе ахвярай стаў архіепіскап Оскар Рамера.

Хоць 1990-я гг. былі часам пашырэння і рэлігійнай, і палітычнай свабоды, аднак былі месцы, дзе хрысціянам было небяспечна, але змяніўся характар небяспекі. У многіх частках Цэнтральнай і Усходняй Еўропы этнічная і нацыянальная ідэнтычнасць стагоддзямі былі звязаны з канкрэтнай формай хрысціянства. Але ў большасці выпадкаў нацыяналістычныя рухі дасягалі сваіх мэт без прымянення сілы. Аднак супрацьлеглы прыклад дае нам Югаславія, дзе лідэры каталіцкай царквы ў Харватыі, сербскай праваслаўнай царквы ў Сербіі і мусульманскай абшчыны ў Босніі-Герцагавіне выступалі ад імя свайго народа, уздымалі нацыянальны дух спасылкамі на барацьбу і пакуты мінулага і стварылі цесныя сувязі з палітыкамі-нацыяналістамі. Тое, наколькі часта розныя арміі вандалізавалі святыя месцы сваіх ворагаў, падкрэслівае значэнне рэлігійных святынь і сімвалаў у гэтай барацьбе.

1990-я гг. таксама адзначаны ростам напружанасці і нават гвалту паміж хрысціянамі і мусульманамі і хрысціянамі і індусамі. У той жа час у пераважна хрысціянскіх краінах мусульмане сутыкаліся з ачарненнем з боку расісцкіх партый і прэсы і нават падвяргаліся нападам, хоць часцей гэта было не ў імя хрысціянства, а ў імя “цывілізацыі” і “заходніх каштоўнасцяў”.

Напружанасць паміж хрысціянамі і мусульманамі вострa праявілася ў Нігерыі, дзе гэтыя канфесіі прыблізна роўныя па колькасці і дзе рэлігія звязана з межрэгіянальнымі канфліктамі. Хрысціяне баяцца, што мусульмане хочуць дабіцца палітычнага дамінавання і ўвесці шарыят, мусульмане баяцца эканамічнай і культурнай моцы хрысціян, якіх падтрымоўваюць Еўропа і ЗША.

К канцу ХХ ст. спробы падавіць хрысціянства сілай, якія адыгрывалі такую вялікую ролю ў гісторыі, адышлт ў мінулае. У былых каталіцкіх цвярдынях Ірландыі, Польшчы і Паўднёвай Еўропе каталіцкая царква застаецца важным інстытутам, але яна больш не можа дамінаваць над жыццём грамадства ў такой ступені, як гэта было раней. Большасць людзей усё яшчэ называюць сябе католікамі і падтрымоўваюць некаторыя сувязі з царквой, але сам дух эпохі змяніўся.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У Лімерзэлі, які можа служыць прыкладам каталіцкай Еўропы, каталіцкая культура пачала прыходзіць у заняпад у 1960-х гг. II Ватыканскі сабор прынёс змены ў літургію, якія большасць людзей прыняла, але былі і тыя сярод старэйшага пакалення, якіх гэта абурала. І. Ламбэр прыводзіць словы мясцовага ўладальніка магазіна: “Яны [святары] таксама былі вымушаны прыстасоўвацца. У былыя часы мы былі тут, за прылаўкам, але цяпер людзі хочуць самаабслугоўвання. Ну, і ў царкве тое ж самае: больш няма алтара, ты можаш дакрануцца да аблаткі!” [2, с. 255]. Узнікала новая форма каталіцызму, у якой большую частку тых роляў, якія раней манапалізавала духавенства, цяпер выконвалі міране.

Плюралізм стаў фактам жыцця. У Афрыцы і Лацінскай Амерыцы назіралася пашырэнне форм рэлігіі, звязаных з ідэяй нараджэння нанова. У моцна рэлігійнай культуры Акры і Кампалы вера ў Бога, у цуды і ў духаў – звычайная справа, і канкурэнцыя ідзе паміж супернічаючымі формамі веры ў звышнатуральнае.

У 1960-х гг. лідэры нядаўна атрымаўшых незалежнасць афрыканскіх дзяржаў часта спрабавалі ўзважаны падыход, каб атрымаць падтрымку асноўных рэлігійных груп краіны. Але у канцы XX ст. палітычныя лідэры ідэнтыфікавалі сябе з канкрэтнай рэлігіяй, як мусульмане ў Судане і Нігерыі. А ў 1991 г. Замбія была аб’яўлена “хрысціянскай дзяржавай”. Гэта выклікала насцярожанасць мусульманскай меншасці і нават многіх католікаў. Аднак П. Гіфард піша, што хрысціянства ў Паўднёвай Афрыцы ўспрымаецца як нешта ў цэлым добрае і тое, што павышае статус звязаных з ім. [1, с. 195–205].

Палітычная выгады асацыяцыі з хрысціянствам часта залежаць ад той ступені, у якой хрысціянства пранікла ў папулярную культуру. Папулярнасць такіх цэркваў часткова тлумачыцца тым, што яны змешваюць разам старажытнае і ультрасучаснае. “У большай частцы Афрыкі моладзь слухае Майкла Джэксана, глядзіць відэафільмы пра Рэмба, паліць Мальбара, п’е кока-колу і носіць Левіс… і красоўкі Найке (ці падробкі пад іх)” [1, с. 61–62]. З другога боку, традыцыйная тэалогія гэтых цэркваў, і ў прыватнасці акцэнт на экзарцызме, адпавядаюць мясцовай мадэлі мыслення [1, с. 76 – 109].

У Еўропе і Паўночнай Амерыцы ў канцы XX ст. пасля распаду СССР знікае асноўны вораг. З 1989 г. назіраюцца неааторыя настроі хрысціянскага трыумфалізма. Католікі-традыцыяналісты, асабліва ў Польшчы, бачылі ў Іаане Паўле II героя. Аднак у цэлым 1990-я гг. былі перыядам росту крытыкі каталіцкай царквы і зніжэння наведвання.

У многіх краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы назіраўся рост цікавасці да рэлігіі, аднак захоўваліся і моцныя традцыі антыклерыкалізма, мфарміраваныя ў сацыялістычную эпоху. Аднак у цэлым сітуацыя ў гэтым рэгіёне ў канцы XX ст. выглядала плюралістычнай пры тым, што рэлігійныя святы сталі дзяржаўнымі. Такім чынам, з аднаго боку рэлігія – справа індывідуальная, з другога, да гэтага часу яна працягвае адыгрываць больш ці менш значную ролю ў палітыцы ў залежнасці ад рэгіёна.

## Літаратура

1. Gifford, P. African Christianity: its public role / P. Gifford. – London: Hurst, 1998. – 384 p.
2. Lambert, Y. Dieu change en Bretagne / Y. Lambert. – Paris: Editions du Cerf, 1985. – 415 p.
3. The terrible alternative: Christian martyrdom in the twentieth century / A. Chandler (ed.). – London: Cassell, 1998. – 186 p.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова